
PIGMALION
ANTON BIELSKI • ARTIOM DANILENKO • MARTA LUŹNIAK

Тэкст: Artiom Danilenko
Marta Luźniak
Ілюстрацыі: Антось Бельскі

у рамках заняткаў “Nasze mityczne dzieciństwo”

Факультэт “Artes LIberales”
Варшава 2023

**Даўным-даўно на востраве Кіпр жыла царская пара. І быў у іх сын, якога звалі Пігмаліён.**



**Маленькі Пігмаліён любіў гуляць у храме, дзе стаялі каляровыя статуі. Яны ажывалі — варта было толькі крыху пафантазіраваць.**



**Часам хлопец уяўляў, быццам багіня Афрадыта прыйшла ў ягоную краму па цацкі, альбо быццам сам Зеўс стаўся пацыентам ягонай лякарні.**



**Аднак хлопец займаўся не толькі выдумляннем гульняў, у якія мог бавіцца з мармуровымі сябрамі...**

**Пігмаліён задумваўся над тым, як ствараліся гэтыя статуі. Яны ж такія падобныя да сапраўдных людзей!**






Хтосьці надзвычай таленавіты стварыў іх! Ягоная праца, бадай, цяжкая, бо не кожны ўпрыгожвае свой дом такімі статуямі.

**Хлопец вырашыў паспрабаваць свае сілы ды зляпіць малую гліняную фігурку, падобную да статуй з храму, у якім ён так часта гуляўся. Спярша фігурка не нагадвала чалавека, але чым больш Пігмаліён стараўся, тым больш чалавечых формаў яна набывала.**



Бацькі Пігмаліёна заўважылі старанне хлопца і захваляваліся:

«Сын, надыйдзе той час, калі табе прыдзецца займацца больш адказнымі і важнымі справамі».

Пігмаліён зажурыўся. Калі статуі захапляюць яго, а іх выгляд прыносіць столькі радасці, ці можа гэта не быць важным?



**Час ішоў. Пігмаліён рос і вучыўся быць мудрым прынцам, які не закідвае патрэбаў свайго царства. Не кінуў ён таксама свайго захаплення скульптурай.**

**Ягоны пакой ператварыўся ў майстэрню, дзе ўсё большала чароўных статуй, ажно ўрэшце найлепшы твор Пігмаліёна апынуўся ў храме сярод скульптур, якія так уразілі прынца ў дзяцінстве.**



Статуяй Пігмаліёна зачароўваліся жыхары ўсяго каралеўства, так як шмат гадоў таму ён сам захапіўся талентам скульптара, які стварыў статуі ў храме.



канец

